# ЭПОХА СЯРЭДНЕВЯКОЎЯ ЯК АКСІЯЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ГІСТАРЫЧНАГА ВЫБАРУ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ МЯЖЫ XX–XXI стст.

***Т. Ю. Трафімчук,***
*аспірант кафедры беларускай музыкі*
*Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі*

Беларуская культура апошніх дзесяцігоддзяў XX – пачатку XXI ст. дэманструе моцны ўздым увагі грамадства да асноў самавызначэння. Гэта ўплывае на розныя сферы мастацкай дзейнасці, дзе ярка адлюстроўваюцца зацвярджэнне новых ідэйна-вобразных прыярытэтаў, а таксама пошук і аднаўленне ідэнтыфікацыйных кодаў «беларускасці». Істотнае месца займае так званы гістарычны выбар, які, апрача іншага, прадугледжвае «ўсебаковае і разгорнутае даследаванне гісторыі станаўлення і развіцця духоўнай (філасофска-светапоглядднай) спадчыны Беларусі» [4, с. 15].

У рэаліях 1970–2000-х гг. зусім невыпадковым з’яўляецца запатрабаванне той плыні, у рэчышчы якой погляд у сваё мінулае становіцца вельмі важным. З аднаго боку, ярка праяўляе сябе актуальная для сусветнай культуры канца XX ст. тэндэнцыя «гульні з культурнай спадчынай» (Ё. Хёйзінга). З другога боку, у сітуацыі, якую, паводле слушнага азначэння Л. Шыхзаманавай, метафарычна можна назваць «пошукам разбуранага Дома» [8], тэма гістарычнай мінуўшчыны набывае сэнс не толькі «архіва» культурнай памяці, але і сімвалічнае значэнне своеасаблівага «люстэрка» сённяшняга жыцця, што раскрывае сябе на ўзроўні пададзеных у шматлікіх мастацкіх артэфактах філасофскіх і этычных абагульненняў, паралелей і метафар.

Як сведчаць культуролагі, пры шырокаахопнасці гістарычнага мыслення з усяго абшару культурна-гістарычнага кантынууму мастацкая свядомасць як найбольш чулая да духоўных інтэнцый грамадства адбірае з прастораў часу толькі асобныя «адзінкі», якія выразна выбудоўваюць экспазіцыю каштоўнасцей таго вопыту мінуўшчыны, які з’яўляецца неабходным для сучаснасці. У беларускай мастацкай культуры мяжы XX–XXI стст. у ліку такіх «адзінак» выступае эпоха Сярэдневякоўя (каля V–XV стст.). Прыцягальная сваёй таямнічасцю, акружаная арэолам «залатых і чорных легенд» (А. Гурэвіч), у той жа час важная і вызначальная для нацыянальнай гісторыі, яна становіцца тым аксіялагічна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значным культурным сімвалам перыяду «новага адраджэння» 1970–2000-х гг., які аб'ядноўвае вакол сябе разважанні і ўяўленні пра беларускі шлях, беларускую гісторыю, пра «старадаўнюю», у пэўным сэнсе «ідэальную» (ідэалізаваную) Беларусь. Апошняе ярка адлюстравалася ў мастацкай творчасці мяжы XX–XXI стст. як «духоўным утварэнні і зрэзе ўсіх форм грамадскай свядомасці і духоўнай культуры» [7]. Не стала выключэннем і музыка, дзе кампазітарскія звароты да гістарычнай тэмы і тэмы беларускага Сярэдневякоўя не толькі ўключыліся ва ўзаемадзеянне ў агульнакультурны «гістарычны» рэзананс, але і сфарміравалі асобную і важную сферу сучаснага музычнага мастацтва, адметную як сваім вобразным светам, філасофіяй, так і музычна-мастацкай мовай, стылістыкай.

Як піша Г. Арлоў, «гучанне музыкі – адзін з найчыстых сімвалаў: частка і веснік той рэальнасці, якая не мае назвы, з якой мы ўступаем у дачыненне праз музыку і музычны вопыт» [6, с. 368–369]. Істотна, што ў творах беларускіх кампазітараў эпоха Сярэдніх вякоў на самай справе паўстала як рэальнасць не столькі гістарычна дакладная, рэканструяваная, колькі мастацкі выдуманая, якая, калі перафразаваць У. Біблера, выйшла за межы «сапраўднай культурнай фармацыі» ў сферу «магчымасцей» апошняй [3]. Іншымі словамі, стала сімвалам – з'явай, якая «больш за самую сябе» (П. Фларэнскі).

«Усякая інтэрпрэтацыя сімвала, – паводле выказвання М. Бахціна, – сама застаецца сімвалам». І далей: «У якой меры можна раскрыць і пракаменціраваць сэнс (вобраза ці сімвала)? Толькі з дапамогай іншага (ізаморфнага) сэнсу (сімвала ці вобраза)» [1]. Падобна гэтаму ў музычнай творчасці мяжы XX–XXI стст. эпоха Сярэдневякоўя ўвасабляецца праз разнастайныя, на ментальным узроўні зразумелыя «спасылкі», праз «цэлы комплекс пазамузычных канатацый – сакральных, касмалагічных, светапоглядных» [5, с. 10]. Прынамсі, шырокае кола твораў прысвечана выдатным культурным і дзяржаўным постацям таго часу («Песнь да Ефрасінні» Г. Кароткінай, «Сны Ефрасінні» Л. Сімаковіч, «У вянок Ефрасінні Полацкай» Г. Ермачэнкава, «Кірылу Тураўскаму» У. Будніка, «Страсці па Рагнедзе» А. Мдзівані, «Князь Наваградскі» А. Бандарэнкі, «Спевы даўнейшых ліцвінаў» В. Кузняцова). Асобую сферу «сярэдневяковай» музычнай творчасці складаюць вобразы старажытных гарадоў і іх архітэктурных помнікаў («Полацкія пісьмёны», «Тур»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Мсціслаў», «Сафія» А. Мдзівані, «Старажытны Полацк», «Сафійскі сабор» Г. Кароткінай, «Крэва» А. Літвіноўскага, «Сабор Святой Сафіі» Г. Ермачэнкава, «Каложа» В. Войціка, «Белая вежа» В. Кандрасюка, «Белая вежа» Л. Мурашка). Беларускіх кампазітараў вабяць знакавыя гістарычныя падзеі эпохі Сярэдневякоўя («Разбурэнне Полацка» А. Мдзівані, «Тры малітвы перад Грунвальдам» Г. Гарэлавай), значнае месца займае таксама «сярэдневяковасць», пададзеная праз старажытныя паданні і легенды («Замкавая гара» Г. Кароткінай, «Магіла льва» Г. Ермачэнкава, «Тураўская легенда» С. Хвашчынскага, «Заслаўская легенда» В. Помазава). Моцным мастацкім стымулам для музычных творцаў становяцца рэшткі сярэдневяковай культуры, якія захаваліся ў сакральных тэкстах, хроніках і летапісах, выявах і скульптуры, інструментальных п’есах і спевах.

Усё гэта пераламляецца праз прызму свядомасці кожнага кампазітара і, як «дзеянне сузірання, якое выцякае з лішку вонкавага і ўнутранага бачання» [2], набывае сваё ўвасабленне ў шэрагу непаўторных, сярэдневякова арыентаваных музычных твораў. Аднак пры разнастайным змястоўным напаўненні і стылістычна індывідуальным рашэнні сярэдневяковай тэмы, амаль адзінай для беларускіх кампазітараў з’яўляецца аксіялагічная ацэнка вартасна-духоўнай сутнасці далёкай эпохі, ярка ўвасобленая ў рамантычна ідэалізаваных і па-аўтарскі непаўторна вырашаных апазіцыях сярэдневяковага sacruma і сучаснай мінучай марнасці. Як унутраны сэнс, так і напал гэтага супрацьпастаўлення вельмі розныя. Духоўная аснова Сярэдневякоўя можа быць пададзена праз філасофскі абагульненыя ідэі асветніцтва, шчырай веры, праз блізкія да іх вобразы-лікі Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, праз зварот да такіх сімвалаў беларускага хрысціянства, як Полацкая Сафія, Гарадзенская Каложа. Іншы аспект кампазітарскіх уяўленняў аб каштоўнасцях Сярэдневякоўя складае апяванне доблесці і мужнасці таго часу, што ўвасоблена ў вобразах-сімвалах Рагнеды, Вітаўта, Давыда Гарадзенскага, старажытных гарадоў Полацка, Турава, Мсціслава. Яшчэ адну сферу кампазітарскіх уяўленняў Сярэдніх вякоў складае камерна-побытавы дух эпохі, які раскрываецца не столькі праз выяўленне канкрэтных персаналій або месцаў, колькі праз зварот да разнастайных жанравых алюзій і стылізацый (гімны, знаменныя або грыгарыянскія распевы, рознага кшталту маршы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На гэта натхняе як уласна ўнутранае кампазітарскае запатрабаванне, цікавасць да свету далёкай эпохі, так і сітуацыя святкавання памятнай даты або падзеі V–XV стст. у культурна-гістарычнай сучаснасці[1]. У любым выпадку многія мастацкі вартыя сярэдневякова арыентаваныя музычныя творы становяцца ўключанымі ў характэрную для беларускай культуры сферу музычных артэфактаў, звязаных з вобразамі даўніны і гісторыі Беларусі, іншымі словамі, дакранаюцца да актуальнай агульнакультурнай тэндэнцыі гістарычнага выбару 1970– 2000-х гг. Акрамя таго, яны раскрываюць важны для беларускай гісторыі і культуры вобраз-сімвал эпохі Сярэдневякоўя, які паўстае, як высвятляецца, неад'емнай аксіялагічнай характарыстыкай сучаснай музычнай і ўсёй мастацкай культуры Беларусі мяжы XX–XXI стст.

1. *Бахтин, М. М.* К методологии гуманитарных наук / М. М. Бахтин // Infolio – Электронная библиотека [Электронный ресурс]. – URL: http://www.infoliolib.info/philol/bahtin/metodol.html.

2. *Бахтин, М. М.* Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин // [Электронный ресурс]. – URL: http://teatr-lib.ru/Library/Bahtin/esthetic/.

3. *Библер, В. С.* О логической ответственности за понятие «диалог культур» / В. С. Библер // Диалог культур XXI [Электронный ресурс]. – URL: http://www.culturedialogue.org/drupal/ru/node/453.

4. *Гісторыя* філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. Т. 1. Эпоха Сярэднявечча / В. Б. Евароўскі [і інш.] ; рэдкал.: В. Б. Евароўскі [і інш.] ; Ін-т філасофіі НАН Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 574 с.

5. *Гуральник, Л. Ю.* Символика и программность у О. Мессиана / Л. Ю. Гуральник // Символ, символическое, символизация в искусстве и культуре : материалы конф. аспирантов Рос. ин-та истории искусств, Санкт-Петербург, 6 дек. 1999 г. / ГНИУК РИИИ ; сост. А. А. Кириллов. – СПб., 2001. – С. 9–16.

6. *Орлов, Г.* Древо музыки / Г. Орлов. – 2-е изд. – СПб. : Композитор-Санкт-Петербург, 2005. – 440 с.

7. *Свирида, Н. Н.* Историческое сознание как явление культуры : автореф. дис. ... канд. филос. наук: 09.00.13 / Н. Н. Свирида. – Омск, 2004 [Электронный ресурс]. – URL: http://www.lib.ua-ru.net/diss/cont/219299.html#download.

8. *Шихзаманова, Л.* Поиск разрушенного Дома / Л. Шихзаманова // Национальные традиции и постмодернизм. Живопись и скульптура 1960–1980-х годов в СССР. – М. : Гос. Третьяковская галерея, 1993. – С. 39–57.

[1] Дарэчы, у адным з апошніх, звязаным з гісторыяй Сярэдневякоўя святам стаў юбілей Грунвальдскай бітвы, які набыў шырокі рэзананс у розных сферах мастацкай культуры і выклікаў да жыцця шэраг музычных «прынашэнняў», накшталт «Грунвальду-1410» У. Байдава, «Трох малітваў перад Грунвальдскай бітвай» Г.Гарэлавай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ